# КАМАНДЗІР АДДЗЯЛЕННЯ

ПЯШЧОТНАЯ лірычная песня гучала ў вячэрняй цішыні прыфрантавога лесу. У цёплую зямлянку, дзе размясцілася аддзяленне вялікага аматара песень сержанта Качанава, ішлі ўсё новыя салдаты. Яны моўчкі ўсаджваліся на свабодных месцах і непрыкметна пачыналі падцягваць.

...Ты, конёк вороной,
передай дорогой,
Что я честно погиб
за рабочих...

Увайшоў камандзір роты. Крайні ад уваходу татарын Батрутдзінаў хутка ўзняўся, каб рапартаваць. Камроты махнуў рукой, асцярожна прысеў на падсунутую скрыню з-пад патронаў. Песня шырылася, расла...

– Эх, каб не такі сумны канец быў, – уздыхнуў беларус Іван Самусевіч, калі заціхла песня.

– З песні слова не выкінеш, – заўважыў сержант Качанаў.

– А што, добрая песня, – прагаварыў ураўнаважаны ленінградзец Іван Іваноў.

Размаўлялі нядоўга.

– Заўтра ідзём на перадавую. Адпачывайце, – сказаў узнімаючыся камандзір роты і, ужо выходзячы з зямляйкі, дадаў: – Одэр будзем фарсіраваць.

Нямала водных перашкод за час вайны фарсіраваў сержант Качанаў. Па вопыту ведаў, якое гэта сур’ёзнае выпрабаванне. Таму гутарыў з кожным байцом аддзялення. Правяраў, як зроблены плыты. Раіў, як лепш перапраўляцца, захаваўшы ў баявым стане зброю...

І час фарсіравання настаў. У ноч на 27 студзеня 1945 года аддзяленне Качанава было на беразе Одэра.

– Галоўнае, сябры, не баяцца, – у каторы раз, хутчэй для парадку, гаварыў Качанаў.

Світала. Маўклівасць ракі таміла салдат. Залпы "кацюш" і дальнабойнай артылерыі, як ні чакалі іх, аказаліся раптоўнымі. Салдаты пабеглі ўперад.

Аддзяленне Качанава першым адчаліла ад берага. З аўтаматам напагатове ўзіраўся сержант у мутную заслону супрацьлеглага берага. Застыў ля кулямёта ленінградзец Іваноў. Здавалася, што плыт не рухаецца: так хацелася хутчэй аказацца там, дзе загадана.

Раптам ажыў маўклівы бераг. Захлёбваліся ў сваёй скорагаворцы нямецкія кулямёты і аўтаматы. Ваду ўзбурлілі міны і снарады. Вось ён, амаль побач.

– Усе ў ваду, – крыкнуў Качанаў і зваліўся з плыта.

За ім ступілі ў ледзяную ваду салдаты аддзялення. Хутка выбраліся на сушу. Залеглі, трапна страляючы па бягучых ад іх гітлераўцах. Адбіты дзве, тры атакі. У аддзяленні амаль усе салдаты ранены. Качанаў азірнуўся на раку. Там маячылі новыя плыты і лодкі. Хутчэй, сябры!

А немцы лезлі, нягледзячы на дзесяткі трупаў сваіх салдат, якія ўсцілалі подступы да акапаўшыхся храбрацоў. І не вытрымалі. Павярнулі назад, пад прыкрыццё трох танкаў, гул матораў якіх даносіўся да сержанта.

– Падрыхтаваць супрацьтанкавыя гранаты! – пракрычаў Качанаў і яшчэ раз з надзеяй паглядзеў на раку.

Пад ім задрыжала зямля. Па брустверу акопчыка секанула кулямётная чарга. Прама на яго рухаўся "тыгр". Качанаў прыўзняўся і кінуў пад блішчэўшую гусеніцу цяжкую гранату. Пачуўся выбух. Танк, развярнуўшыся, спыніўся. Замоўк і другі танк. Залягла нямецкая пяхота. А ў гэты час другая рота ўжо і высаджвалася на маленькім пятачку зямлі, які больш дзвюх гадзін утрымлівалі салдаты аддзялення Качанава.

– За Радзіму, уперад! – устаў ва ўвесь рост сержант і пабег на чале роты на залёгшых ворагаў.

Грудзі абпаліў моцны ўдар. Качанаў зваліўся на сырую зямлю. Было цяжка дыхаць. У лёгкіх нешта хрыпела, клекатала. Далёкай ужо здавалася страляніна. Свядомасць захлёствала нейкая незнаёмая цішыня. Цішыня без песень, запявалам якіх у роце быў Качанаў...

**Камандзір аддзялення // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1970. — 11 жніўня. — С. 4.**